*Заметкі настаўніка*

# Працуюць і вучацца

У САЛІГОРСКАЙ школе рабочай моладзі нядаўна
дбыўся агульны сход навуонцаў (а іх 336 чалавек) з
дзелам кіраўнікоў прадрыемстваў і ўстаноў горада.
азываліся лепшыя навучэны і выдатныя майстры сваіх
праў на прадпрыемствах. ось іх прозвішчы: Пруцаоў М., Жорнасек Ф., Тульцаў В., Арыстаў В., Гуаў Б., Жмуркоў Л., муж і
онка Стасені і многія іншыя. ым жа яны заслужылі такую
авагу ў настаўнікаў, кіраўікоў будоўлі?

Мікалай Пруцакоў чатыры ады назад пацтупіў у нашу
колу ў сёмы клас (у тым жа одзе ён паступіў працаваць
а Салігорскі калійны камбіат у якасці слесара-электрыа). І вось ужо сёлета заканчае дзесяцігодку. Колькі добрых спраў зрабіў Пруцакоў! Бяззменна лічыцца ён адным з лепшых электрыкаў рудніка.

Муж і жонка Стасені два гады назад прыехалі ў Салігорск з Архангельскай вобласці. Віктар Стасеня, уражэнец тутэйшых месц, авалодаў прафесіяй слесара. Жонка стала працаваць на калійным камбінаце, а затым ёй дапамаглі стаць электразваршчыцай.

Пускалася першая чарга калійнага камбіната. Колькі гарачых дзён, недаспаных начэй правяла Аляксандра Стасеня за шчытком! Якія толькі складаныя канструкцыі не даручалі зварваць ёй! Сам жа Віктар не адстае ад жонкі. Уносіць многа рацыяналізатарскіх прапаноў, стараецца як мага лепш выканаць даручаную справу.

Яшчэ летам Стасеня атрымаў кватэру, уладкаваў свае сямейныя справы, а восенню 1963 года падаў заяву ў школу рабочай моладзі.

Колькі прыйшлося пасядзець над кнігамі, канспектамі, каб не адставаць ад таварышаў па вучобе. І старанне дало свой плён: ён стаў выдатнікам вучобы за першае паўгоддзе. Цікава, што і жонка яго Аляксандра, бачачы, што Віктар упарта авалодвае асновамі навук, пачала заглядаць у кнігі. Праз два з палавінай месяцы Віктар сказаў Сашы: «Пойдзем разам вучыцца. Я бачу, як табе таксама хочацца ў школу».

Назаўтра ў восьмым класе аднакласнікі і настаўнікі бачылі мужа і жонку Стасеняў за партай. Цяпер яны добра вучацца і працуюць, хоць ім трэба дагледзець і дваіх малых дзяцей. А нядаўна Салігорскі прамысловы партком прыняў Стасеню ў кандыдаты КПСС.

Арыстаў В., як і Пруцакоў, вучыцца ў 10 класе. Ён таксама ўжо чацвёрты год у нашай школе. Васіль Арыстаў— брыгадзір лепшай маладзёжнай брыгады шахтапраходчага камбайна. Колькі перамог атрымалі арыстаўцы па здабычы калійных солей! Аб іх не раз пісалася ў газетах, гаварылася па радыё. Цяпер Арыстаў распрацаваў новыя прыёмы работы, якія павялічваюць выпрацоўку сільвініту. Не адстае камуніст Васіль і ў вучобе. Марыць, закончыўшы дзесяты клас, паступіць у інстытут.

Многа мастацкай літаратуры чытае брыгадзір. У яго свая багатая бібліятэка. Аб кожнай кніжцы ён расказвае з любоўю.

У школе вучыцца многа выдатных працаўнікоў — усіх нельга пералічыць.

**В. ЦЕСАВЕЦ,**
**настаўнік матэматыкі Салігорскай школы рабочай моладзі.**